# ТЕОРИЯ И ПРАКТИКА ОБУЧЕНИЯ И ВОСПИТАНИЯ В ВУЗЕ И ШКОЛЕ

УДК 37 (476)

***В. С. Болбас***

## РАЗВІЦЦЁ ІДЭЙ МЭТАВЫЗНАЧЭННЯ Ў ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ X–XVIII СТСТ.

*У артыкуле паказана абгрунтаванне неабходнасці мэтавызначэння як найважнейшай ідэі этыка-педагагічнай думкі Беларусі X–XVIII стст. Раскрываецца змястоўна-сутнаснае напаўненне маральнага ідэалу ў якасці галоўнай мэты маральнага выхавання.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Пытанне аб мэтах выхавання з’яўляецца адным з самых значных і дынамічных у педагагічнай тэорыі і практыцы. Шэраг навукоўцаў адзначае, патрэбна вылучаць як ідэальныя, так і рэальныя мэты выхаваўчага працэсу [1, 60]. Т. А. Ільіна разглядае тры групы мэт выхавання: генеральную, мэту на пэўным этапе фарміравання асобы і аператыўную [1, 64]. Значнасць пастаноўкі перспектыўных мэт выхавання, якія дазваляюць актывізаваць маральна-ствaральную дзейнасць выхаванцаў, падкрэсліваў І.С. Мар’енка [2, 74].

Дастаткова доўгі час у педагагічнай навуцы пад мэтай выхавання разумелася фарміраванне гарманічнай усебакова развітой асобы (А. Д. Алфёраў, Ю. К. Бабанскі, В. Г. Бачарова, Я. В. Бандарэўская, Д. І. Вадзінскі, О. С. Газман, В. М. Коратаў, Б. Т. Ліхачоў, З. А. Мількова, Н. Л. Селіванава, А. У. Пятроўскі, М. М. Таланчук, І. Ф. Харламаў і інш.). Змяненне сацыяльна-культурнага асяроддзя, дынаміка парадыгм выхавання зрабілі актуальным пытанне аб канкрэтызацыі дадзенага падыходу ў вызначэнні мэт маральна-выхаваўчага працэсу. “Канцэпцыя выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь” у якасці мэты выхавання вылучае адраджэнне самакаштоўнасці асобы ў грамадстве і яе сацыялізацыю [3, 149]. Н. К. Катовіч акцэнтуе ўвагу на фарміраванні “чалавека-творцы”, “чалавека-дзеяча” [4, 104]. У. Д. Нікандраў слушна адзначае, што выхаванне чалавека ў духу агульначалавечых каштоўнасцей і ёсць правільнае вырашэнне праблемы мэт выхавання [5, 21].

Развіцце ідэй мэтавызначэння ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі непасрэдна вызначалася існаваўшай сукупнасцю сацыяльна-духоўных каштоўнасцей грамадства. Грамадскія каштоўнасці выпрацоўваліся пад уплывам шэрагу ўмоў і фактараў, на іх аснове выпрацоўваліся адпаведныя нормы, правілы, прынцыпы адносін, якія ў сваю чаргу пэўна ўплывалі на фарміраванне выхаваўчых мэт.

Ступень адпаведнасці мэт маральнага выхавання рэальна існуючай у грамадстве сістэме каштоўнасцей у многім забяспечвае выніковасць маральна-выхаваўчага працэсу. Мэтавызначэнне маральнага выхавання канцэптуалізуе ідэі этыка-педагагічнай думкі. Тэлеалагізацыя маральных ведаў закладвае асновы распрацоўкі тэорый маральнага выхавання, засцерагае іх ад механістычнасці і фармалізму.

Перспектыўныя мэты выхавання ўвасабляюцца ў маральным ідэале, які змяшчае аксіялагічныя арыентацыі сваёй гістарычнай эпохі. Рэальныя мэты выхавання адлюстроўваюць фарміраванне пэўных адносін да свету, якія канкрэтызуюцца ў адносінах да самога сябе, іншых людзей, грамадства. Гэтая сістэма адносін да быцця ўтрымлівае ўстаноўку на самаразвіццё, самастварэнне, актыўнае і гарманічнае ўваходжанне ў культурна-гістарычны кантэкст соцыуму. Менавіта праз прызму такога падыходу і разглядалася мэта маральнага выхавання ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі X–XVIII стст.

У першабытным грамадстве маральны ідэал з’яўляўся трафарэтным узорам для адпаведных намераў, дзеянняў і ўчынкаў. Ён усёпаглынальна падпарадкоўваўся служэнню людской супольнасці. Індывідуальнае поўнасцю раствaралася ў калектыўным. Існавалі пэўныя адметнасці ва ўяўленні ідэальных маральных якасцей у мужчын і жанчын.

З надыходам хрысціянства адбываюцца істотныя змены як у адносінах да ролі мэтавызначэння ў жыцці асобы і грамадства, так і да яго змястоўнага напаўнення. Найвышэйшай маральнай якасцю абвяшчалася любоў. Любоў да Усявышняга, бліжняга і наогул людзей, жывой і нежывой прыроды не абмяжоўвалася. І толькі любоў да самога сябе мела жорсткія бар’еры. Адна з яе праяў, гордасць, лічылася найцяжэйшым грахом. У хрысціянстве, па сутнасці, сам сэнс зямнога жыцця зводзіўся да бесперапыннага духоўна-маральнага самаўдасканалення, самабудаўніцтва.

Пастулова з расслаеннем у этыка-педагагічнай думцы Беларусі распрацоўваецца маральны ідэал для кожнага саслоўя. Прычым, нягледзячы на пэўныя адрозненні маральных ідэалаў духавенства, шляхты, простых сялян, кожны з іх быў адначасова арыенцірам маральнага – духоўнага ўдасканалення для ўсяго грамадства.

Для ўсяго хрысціянскага свету маральным ідэалам з’яўляецца Ісус Хрыстос, які ўвасабляў у сабе сінкрэтызм празмерна магчымых маральна-духоўных каштоўнасцей, што адлюстроўвалі абсалютныя ісціну, дабро і прыгажосць. Хрысціянская педагогіка прызнавала, што дасягненне такога маральнага ідэалу ў зямным жыцці немагчыма, але ў якасці ўзору дасканаласці, неабходнасці імкнення і пастаяннага руху па набліжэнні да яго ўвогуле ці нават асобных якасцей ён патрэбен чалавеку ў кожны момант жыцця.

З распаўсюджанага на беларускіх землях антычнага разумення тэлеалогіі з амбівалентнай трактоўкай мэты: а) як растлумачальны

МГПУ им. И.П.Шамякина

прынцып; б) як анталагічная характарыстыка быцця – мэтавызначэнне ў выхаванні ўздымаецца на новы ўзровень.

Так, у этыка-педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння дакладна фармулююцца вывады аб залежнасці сацыяльна-культурнага развіцця грамадства ад правільнага вызначэння мэт маральнага выхавання. Найбольш трапна выразіў гэтыя думкі М. Гусоўскі. На яго думку, нават сам Ісус Хрыстос, якога Бог паслаў на зямлю з місіяй уратавання людзей, “усё ж не здолеў навесці на праведны шлях угаворамі” [6, 173]. Прычынай гэтага М. Гусоўскі лічыў адсутнасць бачнай, канкрэтнай мэты: “Верылі людзі, але чакалі, ці з’явіцца мэта, ці можна будзе прычыны ўбачыць” [6, 173]. Асветнік усведамляў, што імператыўна-павучальныя прадпісанні, якія былі характэрнымі для маральна-выхаваўчых падыходаў сярэднявечча, паступова трацілі сваю эфектыўнасць у новых умовах. Людзі ўсё больш задумваліся над прычынамі, пабуджальнымі матывамі і мэтамі тыхці іншых учынкаў і паводзін.

Францыск Скарына першым на беларускіх землях звярнуўся да забытай у сярэднявеччы антычнай ідэі “калакагатхіі”, згодна з якой галоўнай мэтай выхавання з’яўляецца ўсебакова і гарманічна развітая дасканалая асоба. Ф. Скарына сфармуляваў яе наступным чынам: “*Да совершен будеть человек божий и на всяко дело добро уготован, – яко святый апостол Павел пишеть*” [7, 17].

Істотным было тое, што маральная дасканаласць асобы ва ўяўленні айчынных асветнікаў павінна вызначацца актыўнай маральнай дзейнасцю. Яны не падзялялі думкі Сакрата наконт тоеснасці ведаў аб дабрачыннасці і яе наяўнасці ў індывіда. Яшчэ ў старажытны перыяд дабрачыннасць вылучалася ў якасці мэты выхавання [8, 16]. Феадосій Пячэрскі звяртаў увагу на тое, што “*любовь к Богу не в словах совершается, а в действенных делах*” [9, 157]. Больш за тое, асаблівасць маральных рыс і якасцей асобы заключаецца ў тым, што праяўляюцца яны не пад уздзеяннем знешняга ці ўнутранага прымусу (інакш яны б страцілі свой сэнс), а дзякуючы натуральным патрэбам і неабходнасці.

Многія прадстаўнікі Рэфармацыі прытрымліваліся меркаванняў Лютэра і Кальвіна, якія сцвярджалі неабавязковасць добрых спраў. З іх пункту гледжання, Хрыстос сваёй ахвярай выкупіў збавенне людзям і ад іх патрабавалася толькі глыбокая і трывалая вера. У процівагу гэтаму айчынныя прадстаўнікі этыка-педагагічнай думкі заклікалі да рэальных спраў, якія адлюстроўваюць узровень маральнай асобы. Прычым яны падкрэслівалі, што маральныя ўчынкі і паводзіны павінны будавацца толькі на асабістых альтруістычных унутраных памкненнях і ні ў якім разе не выстаўляцца напаказ. З гэтай нагоды слынны беларускі мысліцель XVI ст. Беняш Будны пісаў: “Некаторыя, зрабіўшы чалавеку дабро, кожнаму аб гэтым расказваюць, а часам і выгаворваюць і тым самым зводзяць на нішто свой добры ўчынак” [10, 135].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Як бы падсумоўваючы такія погляды аб гарманічным спалучэнні веры і добрых спраў, Мелецій Сматрыцкі сэнс жыцця кожнага чалавека бачыць у дзейнасці дзеля агульнага дабра: “Леч тая вера если ест не мертваю, але живою – з справ и поступков, з необлудной до Бога и до ближнего любви походячих, як дерево з овоцу, познавана бывает” [11]. Мысліцель абгрунтоўваў думку, што як вера павінна падмацоўвацца добрымі ўчынкамі, так і карысныя справы павінны мець добрыя мэты, грунтавацца на духоўных памкненнях. “Без Бога, з давных оных мудрцев мовит некоторыйсь, цнота не ест цнота. Без цноты человек не ест человек, яко бы рекши” [12].

З развіццём на беларускіх землях у XVIII ст. асветніцкага гуманізму адбываецца далейшая “карэкціроўка” мэт маральнага выхавання. Паступовы адыход ад схаластыкі і афіцыйнай тэалогіі, рацыяналістычнае асэнсаванне сутнасці чалавека і асноў грамадскага ўладкавання ўводзілі ў маральна-выхаваўчыя мэты істотны *секулярызацыйны і гуманістычны кампаненты*. Абапіраючыся на жыццесцвярджальныя этычныя ідэі перыяду Старажытнай Русі, развіваючы рэнесансавыя вучэнні мысліцеляў XIV – першай паловы XVII стст., прадстаўнікі эпохі Асветніцтва і папярэдняга ёй перыяду дапаўняюць маральны ідэал шэрагам новых якасцей, некаторым з існаваўшых на другарадных пазіцыях надаюць прыярытэтную ўвагу. Па іх перакананні, годнасць чалавека павінна вызначацца ведамі, а не яго паходжаннем. Прычым, на першае месца вылучаюцца прыродазнаўчыя веды. Яны лічылі, што сама прырода чалавека надзяліла яго “натуральным правам” на свабоду, роўнасць і справядлівасць. Рэктар Віленскай акадэміі І. Страйноўскі пісаў: “Кожны чалавек ад прыроды з’яўляецца гаспадаром асобы сваёй, таму ў адносінах да сваёй асобы ён з’яўляецца ад прыроды свабодным і іншым людзям не падпарадкаваным” [13, 118].

Назіраецца спроба ўзняць маральны ідэал над рэлігійнай і саслоўна-класавай ідэалогіяй. Месца чалавека ў грамадстве вызначае не яго саслоўна-карпаратыўны статус, а сукупнасць асабістых рыс, якасцей і заслуг перад людской супольнасцю. Маральны ідэал уяўляўся сканцэнтраваннем агульначалавечых фундаментальных каштоўнасцей, дабрачыннасцей. Так, А. Доўгірд перасцерагае, што ў пытаннях выхавання грамадства не павінна зыходзіць з часовых патрэб. Неабходна весці моладзь да мэт вечных, прывіваць агульначалавечыя каштоўнасці, а таксама кіравацца прыроджанымі пачуццямі і імкненнямі [14].

У працах асветнікаў другой паловы XVIII ст. яўна прасочваецца ўплыў рэвалюцыйных і нацыянальна-вызваленчых ідэй. Маральны ідэал у іх трактоўцы нясе на сабе рысы змагара супраць сацыяльнай несправядлівасці. Беларускім Радзішчавым называюць І. Яленскага, найбольш заўзята пратэставаўшага супраць прыгонніцтва, якое, па перакананні асветніка, з’яўляецца парушэннем натуральнага парадку.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Несправядлівасць узнікла ў выніку ігнаравання законаў чалавечых і боскіх, якія, на думку І. Яленскага, супадаюць [13, 131]. У архівах захоўваецца цікавы рукапіс віцебскага шляхціча С. Зяновіча, дзе ён з рэвалюцыйным запалам занатаваў: “Людзі! Вы адной дарогай з’яўляецеся на свет, аднолькава смерцю прырода завяршае ваша жыццё, вы аднае маці дзеці… адной сям’і родныя браты” [13, 125]. Такім чынам, сцвярджаецца ідэал энергічнага, дзейнага, практычнага, дэмакратычна-арыентаванага чалавека.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна канстатаваць, што ў якасці арыенціра маральна-духоўнага ўдасканалення вылучаўся маральны ідэал, змястоўна-сутнаснае напаўненне якога мянялася на працягу гісторыі развіцця беларускага грамадства. Але абагульненым ён уяўляў цэласную, цнатлівую, дабрачынна-арыентаваную асобу з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і высокім узроўнем маральнай свядомасці і волі, якія прадвызначалі станоўчыя адносіны да маральных каштоўнасцей і ўзорныя паводзіны заўсёды і ва ўсім.

Літаратура

1. Селиванов, В. С. Основы общей педагогики: теория и методика воспитания: учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / В.С. Селиванов / под ред. В. А. Сластенина. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия», 2002. – 336 с.

2. Марьенко, И. С. Нравственное становление личности школьника /И. С. Марьенко – М.: Педагогика, 1985. – 104 с.

3. Концепция воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Нацыянальная сістэма адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь: заканадаўча-прававое забеспячэнне / склад. Е. Л. Петухова. – 2-е выд., дап. – Магілёў: УА МДПУ імя А. А. Куляшова, 2008. – С. 143–170.

4. Катович, Н. К. Личностно-ориентированный подход к деятельности педагога как условие гуманизации учебно-воспитательного процесса / Н. К. Катович // Гуманистическое формирование личности в современных условиях: сб. науч. ст. – Минск: НИО, 1998. – С. 98–107.

5. Никандров, В. Д. Нравственные уроки православия /В.Д. Никандров// Педагогика. – 1997. – № 3. – С.17–24.

6. Парэцкі, Я. І. Паэма Міколы Гусоўскага “Жыццё Іакінфа” / Я.І. Парэцкі // Бел. літаратура і літаратуразнаўства:міжвуз.зб. – Мінск.: Выд-ва БДУ, 1974. – № 2. – С. 156–183.

7. Скарына, Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф. Скарына / уступ. арт., падрыхт. тэкстаў, камент., слоўнік А. Ф. Коршунава, паказальнікі А. Ф. Коршунава, В. А. Чамярыцкага. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.

8. Лавровский, Н. А. Памятники старинного русского воспитания /Н. А. Лавровский// Чтения в императорском обществе истории и древностей Российских при Московском Университете. Повременное издание 1861 г. – Книга третья. – М., 1861. – 310 с.

9. Печерский,Феодосий. Слово о терпении, и о любви, и о посте / Феодосий Печерский // Златоструй. – С. 156–157.

10. Будный, Б. Собраніе нравоучительных, краткихъ и замысловатыхъ ръчей въ трехъ частяхъ / Б. Будный. – М.: 1788. – 270 с.

11. Смотрицкий, М. Велможной панеи, ей милости паней Анне Ходкевичовне, княгини Корецкой и прочая. Паней нам милостивой, о Господе радоватися /



МГПУ им. И.П.Шамякина

М. Смотрицкий // Каліст. Евангеліе учителное, албо Казаня на кождую неделю и свята урочистые. – Евь, 1616. – Арк. 1 нн. – 3 нн., 2 нн.

12. Смотрицкий, М. Велможному пану, его милости пану Богдану Богдановичу княжати Соломирицкому, старостичови Кричевскому и олучицкому, дворянинови кроля его милости, пану моему милостивому, о Господе радоватися / М. Смотрицкий // Евангелиіе учителное, албо Казаня на кождую неделю и свята урочистыи / Калист. – Еўе, 1616. – Арк. 1 нн. – 4 нн., 2 адв. Нн. – 2 нн.

13. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии. Редколлегия: К. П. Буслов [и др.]– Мн.: Наука и техника, 1977. – 280 с.

14. Довгирд, А. О логике, метафизике и моральной философии / А. Довгирд // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: избранные произведения XVI–начала XIX в. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1962. – С. 423–452.

МГПУ им. И.П.Шамякина